Алена ВАБІШЧЭВІЧ, г. Пінск

## Паданне пра Нарач

*Жыве паданне пра дзяўчыну Нару,*
*Яна прыгожай, статнаю была,*
*І верыла заўсёды ў сваю мару,*
*І з ёю ў будучыню па жыцці ішла.*

*Кахала і была сама каханай,*
*Люстэрка любы ёй падараваў.*
*О, як была яна расчаравана,*
*Калі ён не прыйшоў, не пагукаў.*

*Успомніла чароўнае люстэрка,*
*Угледзелася... як нутро шчыміць.*
*Не змераць гора аніякай меркай –*
*Забіты любы... Сіл дзе ўзяць, каб жыць?*

*З рук выпала люстэрка на зямліцу,*
*Разбілася, і... пацякла вада,*
*Ператварыла Нару-Нараніцу*
*У Нарач тая злосная бяда.*

*З тае пары на многа кіламетраў*
*Шумяць лясы, складаюць гімн вясне,*
*З глыбінь вады ці мо'*
*з зямельных нетраў*
*Даносіцца збалелы ўсхліп бы ў сне.*

*І возера ў прывольных хвалях сініх*
*Слыве жыццём цудоўнае пары.*
*Да вышыні матыў уздыме дзіўны*
*І азарыць святлом яго пары.*

*Ён не сціхае і трывожыць сэрца,*
*І розгаласам напаўняе лес:*
*То лёгкім шэптам дзесь*
*штораз прачнецца,*
*То ператворыцца ў згустак болю ўвесь.*

*Гавораць – гэта Нара-Нараніца*
*Ля возера і плача, і пяе,*
*А з неба ёй міргае зараніца,*
*Святло ўсім закаханым раздае.*

*І просіць зберагчы сваё каханне,*
*Пры першым болю не зламацца ўраз.*
*Агортвацца тым*
*ясным-шчодрым ззяннем*
*І Нараніцын выканаць наказ.*